ПАДЗЕЯ

# БРАВА, КАЛЕГІ!

**У Гродне ўрачыста ўзнагародзілі пераможцаў Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча.**

3-га ліпеня падчас урачыстага мітынгу, прысвечанага Дню незалежнасці Рэспублікі Беларусь, адбылося ўзнагароджанне пераможцаў Абласнога літаратурнага конкурсу імя Максіма Багдановіча. З рук губернатара Гродзенскай вобласці Юрыя Караева найвышэйшую літаратурную ўзнагароду Прынёмання атрымалі Юлія Раманюк (намінацыя «Паэзія»); Ірына Салата (намінацыя «Дзіцячая літаратура») і Андрэй Дарожкін (намінацыя «Адкрыццё года»).



Пераможцы Другога абласнога літаратурнага конкурсу імя М. Багдановіча Ірына Салата, Юлія Раманюк і Андрэй Дарожкін падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджання з губернатарам Гродзенскай вобласці Ю. Х. Караевым. Гродна, Плошча Леніна, 3 ліпеня 2026 года

Дарэчы, як стала вядома, Юлія Раманюк і Андрэй Дарожкін перамаглі ў V Міжнародным конкурсе паэзіі і паэтычных перакладаў «Беларусь – Расія. Сожскія берагі дружбы імя Л. Ю. Севера» (Гомель).

Нагадаем, што Абласны літаратурны конкурс імя Максіма Багдановіча па сваёй сутнасці з'яўляецца конкурсам рукапісаў, а гэта значыць, што ў выніку спаборніцтва кніжная скарбонка нашага Прынёманскага краю папаўняецца новымі цікавымі і карыснымі літаратурнымі выданнямі. Пра новыя кнігі мы будзем паведамляць па меры іх выхаду ў свет. А пакуль – шчырыя словы віншавання пераможцам.

Шаноўныя калегі, сардэчна віншуем вас з поспехам. Жадаем вам моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту, радасці ад кожнага пражытага дня і новых яркіх здзяйсненняў у літаратурнай творчасці.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

**На фота:** пераможцы Другога абласнога літаратурнага конкурсу імя М. Багдановіча Ірына Салата, Юлія Раманюк і Андрэй Дарожкін з губернатарам Гродзенскай вобласці Ю. Х. Караевым і старшынёй Гродзенскага абласнога аддзялення Грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Л. А. Кебіч.




ДЫПЛОМ
ДЫПЛОМ
ДЫПЛОМ